Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ЛІПЕНЯ 2013 г. СЕРАДА № 135 (27500) Кошт 1600 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Прыёмныя камісіі будуць працаваць у суботу 27 ліпеня і ў нядзелю 4 жніўня. Апошні дзень прыёму дакументаў для навучання на платнай аснове — 4 жніўня. СТАР. 4

Ацёкі ног часта суправаджаюць розныя захворванні. Часам яны становяцца першым трывожным званочкам, сігналізуюць пра непарадкі ў арганізме. СТАР. 5

ЦЫТАТА ДНЯ

Пётр ВІЦЯЗЬ, кіраўнік апарата Нацыянальнай акадэміі навук:

«Сума продажаў здымкаў са спадарожніка Беларускага касмічнага апарата міністэрствам краіны перавысіла $2 млн. Здымкі спадарожніка БКА выкарыстоўваюць дзевяць беларускіх міністэрстваў. У краіне створана цэлая сетка паскоранага прыёму касмічнай інфармацыі і яе апрацоўкі ў практычных мэтах. Падпісаны таксама шэраг пагадненняў з замежнымі краінамі. Мы назапашваем здымкі і спрабуем прадаваць гэтую інфармацыю замежным партнёрам, падпісаны пагадненні на мільёны долараў».

КАРАТКА

Беларусь і Балгарыя дамовіліся аб павелічэнні квоты дазволаў на нерэгулярныя аўтамабільныя перавозкі пасажыраў для кожнай краіны на 2013 год.

Беларусь выплаціла МВФ $82,4 млн па асноўным доўгу крэдыту стэнд-бай.

Мытныя службы Беларусі і Літвы ініцыююць перавод у статус міжнародных пунктаў пропуску «Відзы-Твярачус», «Мальдзевічы-Адуцішкіс» і «Лоша-Шумскас» з мэтай мінімізацыі чэргаў.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.07.2013 г.

Долар ЗША	8850,00	▲
Еўра	11680,00	▲
Рас. руб.	274,00	▲
Укр. грыўня	1087,56	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 20°
Віцебск	+ 24°
Гомель	+ 23°
Гродна	+ 24°
Магілёў	+ 24°
Мінск	+ 23°

ISSN 1990 - 763X

ПОЛАЦКІ ВОЛАТ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Барысаў камень» у Полацку.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«ВЫЯВІЛІ ПРАБЛЕМУ І НЕАДКЛАДНА ЯЕ ВЫРАШЫЛІ...»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка патрабуе павысіць эфектыўнасць дзейнасці рабочай групы па праблемных пытаннях будаўнічай галіны. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў 23 ліпеня, прымаючы з дакладам аб ходзе работы групы кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Андрэя Кабякова, старшыню Камітэта дзяржкантролю Аляксандра Якабсона і старшыню Камітэта дзяржбяспекі Валерыя Вакульчыка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што перад групай была пастаўлена задача вызначыць глыбінныя праблемы будаўнічай галіны і навесці ў ёй парадак. «Мы дамовіліся: працуем па прынцыпе «выявілі праблему і неадкладна яе вырашылі». Прытым жалезна і жорстка. Таму што гэта праблема ўжо зашкальвае. Насельніцтва вельмі не задаволена, асабліва тыя, хто вядзе будаўніцтва, прад'яўляюць абгрунтаваныя скаргі. Скардзяцца ва ўсе інстанцыі. Гэта ненармальна, недапушчальна ў той час, калі працуе камісія», — сказаў Прэзідэнт. СТАР. 2

ЗАКОН АБ КАНФІСКАЦЫІ МАШЫН У П'ЯНЫХ КІРОЎЦАЎ УВОЙДЗЕ Ў СІЛУ Ў КАСТРЫЧНІКУ

Папраўкі ў некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь па пытаннях узмацнення мер адказнасці за кіраванне транспартным сродкам у стане ап'янення апублікаваны ўчора на Нацыянальным прававым партале і ўвойдуць у сілу праз тры месяцы.

Папраўкі, у прыватнасці, дапускаюць змяненні арт. 61 КК, якія дазволяць прымяняць спецыяльную канфіскацыю транспартнага сродку, у тым ліку які не належыць самому п'янаму кіроўцу, у выпадках, калі заведзена справа па арт. 371-1 «Кіраванне транспартным сродкам асобай, якая знаходзіцца ў стане ап'янення, перадача кіравання транспартным сродкам такой асобе або адмаўленне ад праходжання праверкі (агляду)» КК Беларусі. Канфіскацыя не будзе датычыцца выпадкаў, калі аўтамабілем завалодалі ў выніку ўгону, самаўпраўства і г.д.

Пры гэтым маецца на ўвазе толькі канфіскацыя ў рамках крымінальнага заканадаўства. Гэта значыць, гаворка ідзе пра паўторны выпадак кіравання транспартам на працягу года. Што датычыцца КаАП, то ў гэтым кодэксе будуць значна павялічаны сумы штрафаў: з 15—35 базавых велічынь да 50—100.

Уносяцца дапаўненні і ў арт. 317 «Парушэнне правілаў дарожнага руху або эксплуатацыі транспартных сродкаў» КК. Калі, згодна з дзейным кодэксам, ап'яненне ў гэтым выпадку — абцяжваючыя абставіны, то ў новым варыянце ў артыкул уводзяцца дзве часткі, якія датычацца менавіта нецвярозых кіроўцаў. Згодна з часткай 4, п'яны кіроўца, па віне якога нанесена цяжкае цялеснае пашкоджанне або загінуў чалавек, можа атрымаць ад 6 месяцаў да 7 гадоў пазбаўлення волі. Частка 5 за гібель двух і больш чалавек у ДТЗ па віне нецвярозага кіроўцы будзе прадугледжваць ад 4 д 10 гадоў пазбаўлення волі. Пры гэтым ніякіх альтэрнатыўных варыянтаў пакаранняў за такія злачынствы ў кодэкс не ўводзіцца.

Раней — 19 чэрвеня гэтага года — дакумент быў прыняты Палатай прадстаўнікоў адразу ў двух чытаннях, а 23 чэрвеня яго ўхваліў Савет Рэспублікі. Прэзідэнт Беларусі падпісаў закон 12 ліпеня.

Кар. БЕЛТА.

ФАКТАР НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦІ

Аўтарытэтнае інфармацыйнае агенцтва «Блумберг» апублікавала рэйтынг найбольш схільных да стрэсу краін у свеце. Паводле даных кампаніі, лепш за ўсё жыць у Нарвегіі, а горш за ўсё — у Нігерыі.

Усяго ў даследаванні ўдзельнічалі 73 краіны. Адзнакі ім выстаўляюцца на падставе 7 паказчыкаў. Гэта чаканая працягласць жыцця, узровень беспрацоўя, узровень даходаў, ступень маёмаснага расслаення, узровень забруджвання паветра, а таксама ўзровень карупцыі і колькасць забойстваў за год у разліку на 100.000 чалавек. Пры гэтым чым больш высокі бал атрымлівае краіна, тым больш яна схільная да стрэсу. Сфарміраваная карціна з'яўляецца дастаткова поўнай для таго, каб ахарактарызаваць узровень якасці жыцця насельніцтва. СТАР. 2



БЕЛАРУСБАНК

Дополнительные бонусы от «Беларусбанка»!

ОАО «АСБ Беларусбанк» для своих вкладчиков устанавливает поощрительный процентный доход по срочным банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях:

- **«Сберегательный»**
- **«Ваш выбор»**
- **«Новый 2010»**
- **«Классик плюс»**
- **Премиально-накопительный «Детский»**

С **22.07.2013** или дня открытия вклада (депозита) после указанной даты по **29.08.2013** (включительно) вам будет начисляться поощрительный доход!

Более подробную информацию можно получить в отделениях банка, в Контакт-центре по телефону 147 и на сайте www.belarusbank.by.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912

ПРЭМІІ І СТЫПЕНДЫІ СПЕЦФОНДУ ПРЭЗІДЭНТА — 757 НАВУЧЭНЦАМ І СТУДЭНТАМ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сваім распараджэннем зацвердзіў рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, згодна з якім прысуджаны заахвочванні 757 чалавекам. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Грашовымі прэміямі ў памеры ад Br400 тыс. да Br700 тыс. заахвочаны 6 пераможцаў Рэспубліканскай алімпіяды прафесійнага майстэрства навучэнцаў устаноў, якія рэалізуюць адукцыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, па спецыяльнасці «Тэхнічная эксплуатацыя аўтамабіляў» 2013 года, 28 пераможцаў XXIV Рэспубліканскага конкурсу навуковых біёлага-экалагічных работ, 30 пераможцаў XXI Рэспубліканскага турніру юных фізікаў, 667 пераможцаў заключнага этапу Рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах 2013 года. Прэмія ў памеры Br1 млн прысуджана пераможцу рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года-2012»; у памеры Br2 млн — 4 пераможцам 15-га Аўстрыйскага турніру юных фізікаў.

Грашовымі прэміямі ў памеры ад Br4 млн да Br5,5 млн з уручэннем нагруднага знака лаўрэата фонду заахвочаны 2 пераможцы II Еўрапейскай матэматычнай алімпіяды сярод дзяўчат, 3 пераможцы XX Міжнароднай канферэнцыі юных вучоных па фізіцы, матэматыцы, інфарматыцы, экалогіі (ICYS), 7 пераможцаў 47-й Міжнароднай Мендзялееўскай алімпіяды школьнікаў па хіміі і пераможца XXI Міжнароднай алімпіяды экалагічных праектаў INEPO.

Заахвочвальная стыпендыя ў памеры Br400 тыс. з уручэннем нагруднага знака лаўрэата фонду назначана 2 пераможцам II Еўрапейскай матэматычнай алімпіяды сярод дзяўчат, пераможцу XX Міжнароднай канферэнцыі юных вучоных па фізіцы, матэматыцы, інфарматыцы, экалогіі (ICYS), 3 пераможцам 47-й Міжнароднай Мендзялееўскай алімпіяды школьнікаў па хіміі, пераможцу VII Міжнароднай алімпіяды экалагічных праектаў, пераможцу XXI Міжнароднай алімпіяды экалагічных праектаў INEPO.

Як адзначылі ў прэс-службе, прыняцце распараджэння Прэзідэнта накіравана на забеспячэнне адраснай дзяржаўнай падтрымкі адораных навучэнцаў і студэнтаў.

«БЕЛАРУСКІЯ ДЫЯСПАРЫ МОГУЦЬ ПАШЫРЫЦЬ ПРЭЗЕНТАЦЫЙНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ ЗА МЯЖОЙ»

Такое меркаванне на адкрыцці VI з'езда беларусаў свету выказаў міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Дыяспары таксама могуць умацоўваць аўтарытэт беларускай дзяржавы за мяжой, аб'ектыўна інфармаваць сусветную супольнасць аб працэсах культурнага будаўніцтва ў краіне, прыцягваць інвестыцыі ў нацыянальную культуру, падтрымліваць інтарэсы Беларусі на рынках іншых краін», — сказаў міністр. Паводле яго слоў, падтрымка дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў суайчыннікаў за мяжой, якіх налічваецца больш за 200, разглядаецца як неабходная ўмова дзяржаўнай палітыкі.

Фота БЕЛТА.

Барыс Святлоў адзначыў, што беларускія дыяспары з'яўляюцца неад'емнай часткай беларускага народа. «Мы будзем і далей старанна працаваць з дыяспарамі, аб'ектыўна інфармаваць іх аб тым, што адбываецца на радзіме, эфектыўна падтрымліваць кантакты з прадстаўнікамі і арганізацыйнымі структурамі беларусаў свету», — дадаў міністр.

Цяпер працягваецца работа над дзяржаўнай праграмай «Беларусы ў свеце». Праект закона «Аб беларусах за мяжой» гатовы да разгляду Нацыянальным сходам. «Можна сказаць, што праграма рэалізуецца да яе афіцыйнага прыняцця, а праблем, якія нельга вырашыць без адпаведнага закона, няма. Работа з беларусамі, якія пражываюць за мяжой, праводзіцца бесперапынна», — заўважыў міністр.

Разам з тым ён заклікаў беларусаў свету наладзіць яшчэ больш актыўнае партнёрства з мясцовымі органамі ўлады і распрацаваць перспектыўныя планы ўзаемадзеяння. «У мэтах развіцця адраснага партнёрства Мінкультуры далучае да работы з беларусамі, якія пражываюць за мяжой, абласныя ўстановы культуры, але без зваротнай сувязі яны не змогуць працаваць», — удакладніў міністр.

Барыс Святлоў заўважыў, што адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці Міністэрства культуры з'яўляецца развіццё міжнароднага партнёрства і дэманстрацыя нацыянальных дасягненняў за мяжой. «Выніковай формай такой работы з'яўляюцца Дні культуры Беларусі ў замежных краінах і Дні культуры іншых дзяржаў у Беларусі. Паспяховасць рэалізацыі такога напрамку мы звязваем у тым ліку з развіццём партнёрства з беларускімі дыяспарамі», — падкрэсліў міністр.

За мяжой пражываюць больш як 3,5 млн этнічных беларусаў. Паводле слоў міністра, паказальна, што яны не забываюць аб сваіх каранях, не цураюцца сваёй самабытнасці.

У Мінску 23-24 ліпеня праходзіць VI з'езд беларусаў свету. У форуме ўдзельнічаюць 254 дэлегаты з 21 краіны, а таксама прадстаўнікі міністэрстваў культуры, адукацыі, эканомікі і замежных спраў Беларусі, прадстаўнікі праваслаўнай і грэка-каталіцкай канфесій.

«ВЫЯВІЛІ ПРАБЛЕМУ І НЕАДКЛАДНА ЯЕ ВЫРАШЫЛІ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Ёсць праблема — бяром яе і вырашаем. Прытым пачынаючы ад канкрэтнага дома, які не будуецца або будаўніцтва якога пратэрмінавана па віне будаўнікоў або забудоўшчыкаў, і заканчваючы рашэннямі на заканадаўчым узроўні, калі для гэтага ёсць нейкая неабходнасць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Дзейнасць рабочай групы знаходзіцца пад пастаянным кантролем Прэзідэнта. «Скажу шчыра, я не вельмі задаволены работай групы. Можа, я памыляюся, не ўсё бачу», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт запатрабаваў актывізаваць работу групы, павысіць эфектыўнасць, павялічыць патрабаванні да адказных асоб. «Убачылі ў СМІ які-небудзь зварот групы нашых грамадзян або пачулі аб гэтым — неадкладна праверылі. Калі нехта не выпраўляе — дадзена каманда праваахоўным органам: наручнікі — і ў камеру. І няхай тады думаюць, як працаваць з народам», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што маніторынг праблем будаўнічай галіны — гэта толькі пачатак. «І такім чынам пройдземся па ўсёй краіне, па ўсіх праблемных пытаннях, якія хвалююць людзей, пачынаючы з будаўніцтва і завяршаючы цэнаўтварэннем. Мы вымушаны прымаць радыкальныя меры, калі людзі не разумеюць, калі ім проста, зразумела, спакойна гавораць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

ПРАПАНАВАНЫ ЗАКАНАДАЎЧЫЯ ЗМЯНЕННІ ПА АРЭНДЗЕ ЖЫЛЛЯ

Савет рыэлтараў пры Міністэрстве юстыцыі прапанаваў шэраг мер, накіраваных на рэгуляванне рынку арэнды жылля, паведамілі ў Мінюсце.

У міністэрстве патлумачылі, што ад грамадзян паступаюць пытанні па аказанні паслуг рыэлтарскімі арганізацыямі, якія датычацца падбору варыянтаў да заключэння дагавораў арэнды жылля. На пасяджэнні Савета рыэлтараў пры Міністэрстве юстыцыі было адзначана, то некаторыя рыэлтарскія арганізацыя падаюць несапраўдныя звесткі аб аб'ектах нерухомасці. Пры гэтым рыэлтары адмаўляюцца ад аказання паслугі, калі кліент хоча аплачваць яе толькі па факце засялення.

«Кіраўнікі вядучых рыэлтарскіх арганізацый лічаць неабходным унясенне змяненняў у заканадаўства з мэтай замацавання абавязку рыэлтарскай арганізацыі аказваць паслугі па арэндзе жылля толькі пры ўмове аплаты па факце засялення», — заяўляе савет. Акрамя таго, члены гэтага органа аднадушна сышліся ў думцы аб рэгуляванні парадку размяшчэння (распаўсюджвання) рэкламы рыэлтарскімі арганізацыямі ў інтэрнэце. Прапанавана абавязаць рыэлтарскія фірмы ўказваць рэквізіты дагавора, на падставе якога размяшчаецца рэклама. Грамадзянам жа неабходна пацвярджаць законныя правы на рэкламу аб'екта нерухомасці. На думку прафесіяналаў, такія меры абмяжуюць магчымасці падбору варыянтаў здзелкі і працу «чорных» рыэлтараў.

Таксама ў Мінюсце ў чарговы раз звяртаюць увагу на тое, што спажыўцы рыэлтарскіх паслуг маюць права патрабаваць унясення ў дагавор умовы аплаты па факце засялення. «Адмаўленне рыэлтарскай арганізацыі ад аказання паслуг пры ўмове ўнясення аплаты спажыўцом па факце падбору кватэры з'яўляецца беспадстаўным», — заявілі ў міністэрстве.

Кар. БЕЛТА.

У ПАМЯЦЬ АБ ЗАГІНУЛЫХ У ВАЕННЫХ КАНФЛІКТАХ

Чатырохметровы крыж, а таксама купал вышынёй з трохпавярховы дом устаноўлены ў Гродне на храме Адсячэння галавы Іаана Прадцечы падчас урачыстасці, каб ушанаваць памяць аб загінулых у ваенных канфліктах.

Фота БЕЛТА.

Купал, які выраблены мясцовымі майстрамі і складаецца з 2500 дэталяў, падняліна 50-метровую вышыню з дапамогай крана. Гэта адбылося падчас урачыстасці ў памяць аб воінах-інтэрнацыяналістах і тых, хто загінуў у баях за вызваленне горада над Нёманам.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

■ Гучная справа

АЛЯКСАНДРА ВАРЛАМАВА ВЫЗВАЛІЛІ Ў ЗАЛЕ СУДА

Вядомы мадэльер Варламаў прыгавораны да 5 гадоў абмежавання волі з канфіскацыяй маёмасці без накіравання ў калонію адкрытага тыпу. Такое рашэнне пасля 5 месяцаў судовых слуханняў было агучана ўчора ў судзе Ленінскага раёна Мінска.

Былы дырэктар прыватнага прадпрыемства «Агенцтва моды Сашы Варламава» прызнаны вінаватым па чатырох артыкулах Крымінальнага кодэкса: **ва ўхіленні ад выплаты падаткаў, махлярстве ў асабліва буйным памеры, прысваенні маёмасці, крадзяжы шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі.** У прыватнасці, паводле звестак абвінавачання, Варламаў рэкламаваў платныя паслугі свайго агенцтва за кошт сродкаў дзяржбюджэту, якія вылучаліся на рэкламу фестывалю «Млын моды». Акрамя таго, на працягу 2005—2011 гадоў браў наяўныя грошы за навучанне мадэляў, але не ўносіў іх на разліковы рахунак прыватнага прадпрыемства «Агенцтва моды Сашы Варламава». Такім чынам у розныя перыяды навучання з Варламавым разлічваліся некалькі дзясяткаў мадэляў і іх прадстаўнікоў, калі гаворка ішла пра непаўналетніх удзельнікаў праекта. Яны плацілі ад 70 тыс. да амаль 2 млн рублёў у залежнасці ад тэрмінаў навучання.

Паколькі ўтрыманне пад вартай было зменена на падпіску аб нявыездзе, Аляксандра Варламава адпусцілі ў зале суда. Разам з тым, суд пастанавіў спагнаць з яго матэрыяльны ўрон на карысць шэрагу ўстаноў і грамадзян. Самы буйны — Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту (больш за 2,3 млрд рублёў). У якасці пацярпелых па справе праходзяць больш як 350 чалавек — мадэлі і іх бацькі, дызайнеры, стылісты. Згодна з прыгаворам суда, Аляксандру Варламаву на працягу 2 гадоў забаронена займаць пасады, звязаныя з арганізацыйна-распарадчай дзейнасцю.

Надзея ПАЎЛАВА

■

ФАКТАР НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Беларусь ў рэйтынгу «Блумберга» выглядае вельмі прыстойна. Яна займае 41 месца — а гэта 34,1 бала. Мы пакінулі ззаду ўсіх суседзяў, акрамя Польшчы, якая заняла 46 месца і, паводле рэйтынгу, з'яўляецца на 1,3 бала менш стрэсавай, чым Беларусь.

А вось Расія, нягледзячы на двухразовую перавагу над Беларуссю па ўзроўні даходаў насельніцтва, апынулася, па выніках даследавання, далёка ззаду нашай краіны — на 25 месцы (43,8 бала). Літва і Латвія таксама саступілі Беларусі, размясціўшыся непадалёк: 38 і 34-е месцы адпаведна. Украіна ў рэйтынг уключана не была, але, наколькі можна меркаваць па бягучай інфармацыі, і яна б сур'ёзна саступіла Беларусі.

Дарэчы, такія вынікі цалкам адпавядаюць той дынаміцы, якую Беларусь паказала ў міжнародным рэйтынгу па індэксе развіцця чалавечага патэнцыялу, узняўшыся адразу на 10 пазіцый да 65-га месца.

Вельмі паказальным з'яўляецца тое, што Беларусь знаходзіцца на ўзроўні ці апярэджвае па паказчыках «стрэсаўстойлівасці» шэраг краін, насельніцтва якіх намінальна значна багацей, чым беларусы. І Літва, і Латвія, і Расія апярэджваюць нашу краіну па гэтым паказчыку больш чым удвая (зразумела, без уліку пакупніцкай здольнасці даходаў).

Але адставанне па гэтым паказчыку кампенсуецца больш высокім узроўнем сацыяльнай справядлівасці, нізкім узроўнем беспрацоўя і, у выпадку з Расіяй, больш спрыяльным крымінагенным становішчам.

Дарэчы, па паказчыку індэкса Джыні наша краіна заняла 11 месца ў рэйтынгу (паміж Германіяй і Мальтай), а па паказчыку афіцыйнага ўзроўню беспрацоўя — першае месца.

Такім чынам, даследаванне агенцтва «Блумберг» пацвердзіла лідарства Беларусі



на постсавецкай прасторы па паказчыках чалавечага патэнцыялу. Галоўнае зараз — зрабіць стаўку на чалавечы патэнцыял як галоўную рухаючую сілу эканамічнага развіцця.

Юрый ЦАРЫК,
палітычны аналітык,
кіраўнік Беларускай
групы развіцця.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ПАТРАБАВАЛІ ХАБАР У $500 ТЫС.?

Камітэт дзяржаўнай бяспекі выявіў проціпраўную дзейнасць кіраўнікоў Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў і прадстаўнікоў камерцыйных структур, якія займаліся вымагальніцтвам за прадастаўленне работ на аб'ектах спажыўкааперацыі, а таксама за продаж інвестарам зямельных участкаў і аб'ектаў нерухомасці.

Як паведамляюць у прэс-службе КДБ Беларусі, памеры хабару, якія патрабаваліся да перадачы за магчымасць будаўніцтва і продажу нерухомасці, дасягалі 500 тыс. долараў. Падчас перадачы чарговай часткі хабару быў затрыманы начальнік упраўлення капітальнага будаўніцтва і яго намеснік, а таксама старшыня Белкаапсаюза, прадстаўнікі камерцыйных структур. Заведзена 5 крымінальных спраў, падазроныя змешчаны ў следчы ізалятар.

Святлана БАРЫСЕНКА.

МАСТАЦТВА РАТУЕ СВЕТ

У Магілёве прайшоў вулічны фестываль, дзе не проста забаўлялі гараджан, але і збіралі сродкі на дапамогу дзіцячаму хоспісу.

Дабрачынны аўкцыён правяла арганізацыя «Магілёўскія майстры»: на аўкцыёне вырабаў рамеснікаў і мастакоў удалося сабраць 3 мільёны рублёў.

Само свята разгарнулася на пешаходнай вуліцы Ленінскай, дзе вулічныя музыканты і артысты заклікалі магілёўцаў зрабіць свой уклад у добрую справу. Прымалі не толькі грошы, але і цацкі, канцтавары, адзенне. Агульны добры настрой не псаваў і дождж. Мастацкія выставы, бодзі-арт і дабрачыннае піццё чаю прыцягнулі людзей да акцыі. У грамадскай дабрачыннай арганізацыі «Магілёўскі дзіцячы хоспіс» удзячны за дапамогу, але лічаць вельмі важным і тое, што людзі больш даведаліся пра хоспіс і пра тое, як трэба падтрымаць дзяцей, якія пакутуюць ад невылечных хвароб.

Ілона ІВАНОВА.

«ЗДАЦЬ» ЦТ ЯШЧЭ РАЗ...

Зборнікі заданняў цэнтралізаванага тэсціравання 2013 года ўжо паступілі ў продаж. Яны змяшчаюць усе 10 арыгінальных варыянтаў, якія былі на сёлетнім тэсціраванні. Пра гэта журналісту «Звязды» расказаў дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай Фяськоў.

Дапаможнікі кожны год выпускаюцца да заканчэння прыёму дакументаў у ВНУ для таго, каб усе ахвотныя маглі яшчэ раз прайсціся па тэстах, якія яны выконвалі, і праверыць свае памылкі. Цяпер не толькі ў абітурыентаў будзе магчымасць скласці ўласную думку пра змест і складанасць матэрыялаў цэнтралізаванага тэсціравання.

Надзея НІКАЛАЕВА.

РАСКРЫТА ЗАБОЙСТВА ГАМЯЛЬЧАНКІ

Рэзанансное злачынства раскрыта гомельскімі аператыўнікамі. Яны за суткі ўстанавілі асобу злачынцы і месца знаходжання дзяўчыны, якая нечакана знікла.

Начальнік упраўлення крымінальнага вышуку УУС Гомельскага аблвыканкама Віктар Чыкуноў расказаў, што ў аддзел унутраных спраў адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля з заявай пра знікненне сястры звярнулася жыхарка абласнога цэнтра. Жанчына паведаміла, што ёй патэлефанаваў сужыцель сястры і расказаў, што яго каханая не вярнулася дадому. Дарэчы, 23-гадовая гамяльчанка ведала тры замежныя мовы і падзарабляла рэпетытарствам. Пасля чарговага ўрока маладая жанчына не вярнулася, а мабільны тэлефон быў не даступны.

Праваахоўнікі хутка выйшлі на яе знаёмага, маладога чалавека, з якім дзяўчына сустракалася раней, але паўгода таму развіталася. Затаіўшы крыўду, ён выношваў план жорсткай расправы. Яшчэ ў красавіку выкапаў у лесе яму глыбінёй у чалавечы рост, а потым падгаварыў на ўдзел у здзяйсненні злачынства сваіх знаёмых, сямейную пару. У суботу, 20 ліпеня, дзяўчыне патэлефанавалі наконт рэпетытарства і прызначылі сустрэчу. Маладая жанчына адчыніла дзверы будучай ахвяры, а калі тая ўвайшла, ззаду ёй быў нанесены ўдар малатком па галаве. Цела дзяўчыны злачынцы сярод белага дня вынеслі і пагрузілі ў багажнік легкавога аўтамабіля. Затым вывезлі ў лес і закапалі ў загадзя падрыхтаванай яме.

Вінаватыя ў трагічнай смерці маладой жанчыны затрыманы і ўжо даюць паказанні.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

У МІНСКУ КАНФІСКАВАНА БУЙНАЯ ПАРТЫЯ МЕТАНОНУ

У кватэры на вуліцы Кальварыйскай, якую здымаў 24-гадовы мінчанін са сваёй сужыцелькай, выяўлена і канфіскавана каля 2 кг метанону.

Наркабізнесам малады чалавек займаўся апошнія паўгода. Пры гэтым ён імкнуўся максімальна не прыцягваць да сваёй дзейнасці лішняй увагі. Кантактаваў з кліентамі галоўным чынам праз інтэрнэт. Для разлікаў выкарыстоўваў сістэму электронных плацяжоў. У мэтах канспірацыі рэгулярна мяняў здымнае жыллё, аўтамашыны, гаджэты, нумары мабільных тэлефонаў. Тым не менш супрацоўнікі наркакантролю ГУУС і Фрунзенскага РУУС Мінска пры сілавой падтрымцы байцоў спецпадраздзялення МУС «Алмаз» некалькі дзён таму ўсё ж такі затрымалі гандляра з буйной партыяй метанону.

Надзея ДРЫЛА.

УДАСКАНАЛЕННЕ ЎМОЎ АПЛАТЫ ПРАЦЫ КІРАЎНІКОЎ КАМЕРЦЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ДЫКТУЕЦЦА ПАТРАБАВАННЯМІ ЭКАНОМІКІ

Пытанні аплаты працы заўсёды актуальныя — і ў маштабах усёй краіны, і для канкрэтнага працоўнага калектыву, і для кожнага чалавека паасобку. Безумоўна, асаблівы прадмет для абмеркавання — заработная плата кіраўнікоў. Сярод радавых грамадзян існуе думка аб тым, што яна проста-такі завоблачная, а самі кіраўнікі часта называюць яе неадэкватнай сваім намаганням, узроўню прафесіяналізму і нервовым выдаткам. Пра тое, якая ж сістэма аплаты працы менеджараў вышэйшага звяна і якія ў ёй будуць змены — у інтэрв'ю міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяны ШЧОТКІНАЙ.

— Марыяна Акіндзінаўна, пастановай урада № 597 удасканалены ўмовы аплаты працы кіраўнікоў камерцыйных арганізацый. Чарговы раз прыняты захады па ўзмацненні залежнасці ад вынікаў фінансава-гаспадарчай дзейнасці. Якія асноўныя навацыі змяшчае дакумент?

— Варта адзначыць, што ўдасканаленне нормаў заканадаўства — працэс бесперапынны, ён павінен быць карэляваным з патрабаваннямі эканомікі. Што тычыцца згаданай урадавай пастановы (яна, дарэчы, уступае ў сілу з 1 верасня гэтага года), то я б назвала яе своечасовым рэагаваннем на тыя змены, якія адбываюцца ў эканоміцы.

Гэтай пастановай, перш за ўсё, пашыраны правы органаў, якія заключаюць з кіраўнікамі арганізацый кантракты, па ўсталяванні больш гнуткай сістэмы стымулюючых выплат. Зараз у іх з'явіўся выбар: прэміі, каротказрміновыя бонусы, гадавы бонус, узнагароджанне па выніках працы за год, узнагароджанне ў працэнтных адносінах ад выручкі або ад сумы знешнеэканамічнай здзелкі. Пры гэтым агульная сума выплат стымулюючага характару (прэміі, каротказрміновыя бонусы) не павінна перавышаць трох акладаў у разліку на месяц. За год гэта атрымліваецца 36 акладаў. Але, заўважце, яны не выплачваюцца аўтаматычна — іх трэба зарабіць, забяспечыўшы выкананне прагнозных паказчыкаў.

Зменены памер і парадак выплаты гадавога бонуса. Ён будзе выплачвацца кіраўніку арганізацыі ў памеры да 1% ад атрыманай па выніках справаздачнага года чыстага прыбытку арганізацыі, але не больш за 12 акладаў пры ўмове выканання ўсіх даведзеных прагнозных паказчыкаў.

Вельмі важна, што на перыяд мадэрнізацыі прадпрыемстваў іх кіраўнікам могуць устанаўлівацца фіксаваныя аклады. Гэта дасць магчымасць у нясклады перыяд падтрымаць кіраўнікоў прадпрыемстваў, даўшы ім пэўны ўзровень аплаты працы.

Акрамя таго, зацверджаны пералік выплат, якія не ўлічваюцца пры вылічэнні каэфіцыента суадносін сярэдняй заработнай платы кіраўніка і сярэдняй заработнай платы па арганізацыі ў цэлым, які будзе ўжывацца арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці. Дарэчы, раней ён зацвярджаўся толькі для дзяржаўных арганізацый. Гэтай нормай усе арганізацыі пастаўлены ў роўныя ўмовы.

Агульная сума выплат стымулюючага характару (прэміі, каротказрміновыя бонусы) не павінна перавышаць трох акладаў у разліку на месяц.

— Чым абумоўлена абмежаванне каэфіцыента суадносін сярэдняй заработнай платы кіраўніка камерцыйнай арганізацыі і сярэдняй заработнай платы па арганізацыі (8,0)? Лічыцца, што вопытнага кваліфікаванага кіраўніка даволі складана знайсці — менеджары вышэйшага звяна і высокага класа, можна сказаць, у дэфіцыце. Ці не пацягне ўведзены пастановай абмежавальнік зарплаты кадравую праблему?

— Пастаноўка пытання — няправільная і некарэктная. Прынятая пастанова не ўвяла ніякай новай нормы па суадносінах сярэдняй заработнай платы кіраўніка камерцыйнай арганізацыі і сярэдняй заработнай платы па арганізацыі. Гэтая норма дзейнічае ў рэспубліцы з 1999 года (пастанова Савета Міністраў ад 31 мая 1999 года № 822) — пачыналі тады з каэфіцыента 3,5. З 2009 года і па сёння каэфіцыент суадносін можа вызначацца да 8,0 уключна. Прычым механізм яго вызначэння лібералізаваны. Так, калі ў 2009 годзе каэфіцыент суадносін звыш 5,0 вызначаўся пастановай урада, то цяпер каэфіцыент суадносін звыш 6,0 (да 8,0) устанаўліваецца органам, які заключае кантракт з кіраўніком, па ўзгадненні з прэм'ерміністрам. А ў дачыненні да кіраўнікоў прыватных арганізацый — толькі органам, які заключае з імі кантракт. Пры гэтым хачу звярнуць увагу на тое, што фактычны каэфіцыент суадносін вылічваецца нарастаючым вынікам з пачатку года, а не за месяц, і асаблівага ўплыву на кадравую палітыку ў дачыненні да менеджараў вышэйшага звяна не аказвае.

— Як каэфіцыент 8,0 суадносіцца з сусветнай практыкай?

— На думку міжнародных экспертаў, такія суадносіны сярэдніх заработных плат топ-менеджараў арганізацыі і работнікаў з'яўляецца найбольш аптымальным.

Прывяду для параўнання некалькі паказальных, на мой погляд, даных міжнароднай кансалтынгавай кампаніі Hay Group: разрыў паміж памерам заработнай платы менеджараў сярэдняга і вышэйшага ўзроўняў і радавымі супрацоўнікамі складае ва Украіне 9,4 раза, у Расіі — 8,3, у Венгрыі — 6,6, у Чэхіі — 6,4, у Італіі — 3,9, у ЗША — 3,8 раза.

— Якія выплаты стымулюючага характару прадугледжаны ў Беларусі для кіраўнікоў камерцыйных арганізацый? Ці плануецца пашырэнне (або звужэнне) іх спектра?

— Пералік выплат стымулюючага характару для дзяржаўных арганізацый і арганізацый з доляй уласнасці дзяржавы ў іх статутным фондзе больш за 50% устаноўлены ў новым палажэнні, зацверджаным пастановай № 597. Прычым пры распрацоўцы такіх захадаў вывучаецца міжнародны вопыт. Узяць, напрыклад, гадавы і каротказрміновыя бонусы — яны шырока распаўсюджаны ў сусветнай практыцы (у Аргенціне, Венесуэле, Германіі, Італіі, Кітаі, Карэі, Польшчы, Чэхіі, Швецыі і іншых краінах).

Выплаты стымулюючага характару кіраўнікам арганізацый прыватнай формы ўласнасці і арганізацый з доляй уласнасці дзяржавы ў 50% і менш вызначаюцца органам, які заключыў кантракт, у самім кантракце. Для гэтых кіраўнікоў пералік стымулюючых выплат цэнтралізавана не вызначаецца. Такім чынам, звужаць або пашыраць іх спектр — кампетэнцыя органаў, якія складалі кантракт.

Алена ПРУС, БЕЛТА.

■ Дарэчы

РОСТ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ Ў МІНСКУ НЕАБХОДНА АБМЕЖАВАЦЬ...

Далейшага беспадстаўнага росту заработнай платы пры эканамічных умовах, што склаліся, у сталіцы быць не павінна. Такую думку выказаў на пасяджэнні Мінгарвыканкама, прысвечаным вынікам сацыяльна-эканамічнага развіцця Мінска за студзень—чэрвень 2013 года, старшыня гарадскога выканаўчага камітэта Мікалай Ладуцька.

Ён адзначыў, што некаторыя суб'екты гаспадарання ўжо дасягнулі таго ўзроўню па зарплаце, вышэй за які яе павялічваць нельга.

— Хоць на галіновых прадпрыемствах прамысловасці рост павінен быў бы адбыцца. Але для гэтага неабходныя пэўныя ўмовы — продаж. А калі продажу няма, абвастраюцца іншыя праблемы, — падкрэсліў старшыня Мінгарвыканкама. Паводле яго слоў, у цэлым па горадзе далейшага росту заработнай платы быць не павінна.

— Мы ўжо выйшлі на той максімальны сярэдні ўзровень, які павінен быць у Мінску, — удакладніў ён.

Паводле інфармацыі Мінгарвыканкама, намінальная сярэднямесячная заработная плата за студзень—май гэтага года склала 6096 тыс. рублёў пры прагнозе на 2013 год 6005 тыс. У тым ліку за апошні вясенні месяц аплата працы ўзрасла да 6305 тыс. рублёў, або 726 долараў у эквіваленце. Суадносіны тэмпаў росту прадукцыйнасці працы і рэальнай заработнай платы склалі за гэты перыяд 0,82 пры заданні 1,03.

«Мінск-Навіны»

КІРАЎНІКІ АДКАЖУЦЬ ЗА НЕВЫКАНАННЕ ПЛАНАЎ МАДЭРНІЗАЦЫІ

У Беларусі павышаецца адказнасць кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў за невыкананне планаў мадэрнізацыі. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў № 637 ад 18 ліпеня 2013 года, якая афіцыйна апублікавана ўчора на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

Пастанова прынята для ўзмацнення адказнасці кіраўнікоў арганізацый за забеспячэнне развіцця галін і вытворчасцяў, устойлівага росту нацыянальнай эканомікі.

Згодна з дакументам, невыкананне кіраўніком або зрыў тэрмінаў выканання мерапрыемстваў, вызначаных у праграме (плане) комплекснай мадэрнізацыі прадпрыемства, на рэалізацыю якіх выдзелены бюджэтныя сродкі, будзе кваліфікавацца як «грубае парушэнне працоўных абавязкаў». Акрамя таго, у кантракты, якія заключаюцца з кіраўнікамі арганізацый, будуць унесены пункты, якія прадугледжваюць абавязак кіраўніка забяспечваць выкананне мерапрыемстваў, вызначаных у праграме (плане) комплекснай мадэрнізацыі арганізацыі, і адказнасць за іх невыкананне.

Дзяржаўным органам і арганізацыям даручана ў двухмесячны тэрмін прывесці кантракты, заключаныя з кіраўнікамі арганізацый, у адпаведнасць з пастановай. Кіраўнікам рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных ураду Беларусі, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама даручана забяспечыць кантроль за выкананнем узгодненых імі праграм (планаў) комплекснай мадэрнізацыі арганізацый.

Кар. БЕЛТА

■

■ Прыёмная кампанія 2013

У АБІТУРЫЕНТАЎ ЗАСТАЛІСЯ ДВА ДНІ НА РОЗДУМ

25 ліпеня а 18 гадзіне дзверы прыёмных камісій ВНУ для абітурыентаў зачыняюцца. Будзе спынена і выдача дакументаў з мэтай пераходу на іншую спецыяльнасць. Пры гэтым у абітурыентаў, якія паспеюць трапіць у будынак да таго, як яго дзверы на ўваход зачыняцца, застаецца магчымасць падаць свае дакументы ў прыёмную камісію.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Трэба заўважыць, што прагнозы наконт таго, ці ўдасца ВНУ ўкамплектавацца і, калі ўдасца, то наколькі «якасным» будзе гэты набор, мелі сёлета хутчэй песімістычны характар. Яшчэ на этапе рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне стала зразумела, што колькасць ахвотных штурмаваць ВНУ зменшылася амаль на 24 тысячы. А пасля абвячшэння вынікаў удзельнікаў ЦТ права ўдзельнічаць у конкурсным адборы пазбавіліся яшчэ больш як 40,5 тысячы чалавек. Такім чынам колькасць месцаў у ВНУ (на бюджэтнай і платнай формах навучання) аказалася большай за колькасць патэнцыяльных прэтэндэнтаў на студэнцкі білет.

Але, як і прагназавалі арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання, канкурэнцыя на самых прэстыжных сярод моладзі спецыяльнасцях сёлета абвастрылася, паколькі ўзрасла колькасць абітурыентаў, якія набралі на ЦТ высокія балы. Па словах дырэктара Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалая Фяськова, зараз назіраецца пэўная палярызацыя паміж тымі, хто атрымаў высокія вынікі, і тымі, хто не пераадолеў вызначаны парог (гэта пераважна выпускнікі ўстаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, а таксама выпускнікі мінулых гадоў). І адна, і другая група досыць вялікія. Калі казаць пра сярэднестатыстычнага абітурыента, то на ўяўнай крывой ён знаходзіцца дастаткова далёка ад верхняй групы і бліжэй да групы з нізкімі баламі.

Зразумела, што першымі ў прыёмныя камісіі нясуць дакументы тыя маладыя людзі, якія цалкам упэўнены ў сваіх балах і даўно вызначыліся і з ВНУ, і са сваёй будучай спецыяльнасцю. Напрыклад, свой намер атрымліваць адукацыю ў БДУ агучылі ўжо 7 уладальнікаў сумы балаў, якая перавышае 390. І яшчэ 11 абітурыентаў маюць лічбу ад 384 да 389. Рэкорднай сумай балаў (399!) можа пахваліцца выпускніца Мазырскага абласнога ліцэя Вольга Тугай, якая выбрала спецыяльнасць «хімія высокіх энергій». 397 балаў маюць Ніна Барадуліна, выпускніца сталічнай гімназіі № 22, і Настасся Таран, выпускніца Рэчыцкага раённага ліцэя. Абедзве дзяўчыны з'яўляюцца ўнікальнымі ўладальнікамі трох стабальных сертыфікатаў. Ніна Барадуліна збіраецца вывучаць у БДУ сусветную эканоміку, а Настасся Таран зацікавілася актуарнай матэматыкай. Прыемна адзначыць, што большасць уладальнікаў самых высокіх балаў збіраюцца паступаць на факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Такім чынам, самую вядомую, не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі, матэматычную школу чакае добрае папаўненне. А вось на фізічным факультэце, наадварот, не выключаны, як заўсёды, праблемы з запаўненнем месцаў.

Інфармацыя пра ход прыёму заяў і заяўленыя балы апошні раз будзе абноўлена 25 ліпеня а 15 гадзіне. Такім чынам, у абітурыентаў будуць тры гадзіны для таго, каб зрабіць свой канчатковы выбар.

Увогуле, калі аналізуеш лічбы прыёму на бюджэтную і платную форму навучання, то не перастаеш здзіўляцца аптымізму кіраўніцтва БДУ. Напрыклад, на эканамічным факультэце на спецыяльнасць «менеджмент» збіраюцца прыняць на «бюджэт» 34 чалавекі, а на платную форму навучання — 221. На факультэце філасофіі і сацыяльных навук план набору на сацыялогію на «бюджэт» складае 34 месцы, а на платную форму навучання — 105. На псіхалогію — 20 чалавек на бюджэтную і 60 — на платную. На міжнародныя адносіны — 30 на «бюджэт» і 125 — на платнае аддзяленне. У Дзяржаўным інстытуце кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ на спецыяльнасць «сацыяльная работа» — 8 на «бюджэт» і 52 — на платнае навучанне і гэтак далей. Затое на спецыяльнасць «фізіка» план прыёму на платную форму навучання складае ўсяго 24 месцы, а за бюджэтныя сродкі тут гатовы навучаць 160 чалавек. Вось толькі ці знойдуцца ахвотныя?

У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі, як і чакалася, няма ніякіх праблем з запаўненнем месцаў на спецыяльнасцях факультэта камп'ютарных сістэм і сетак. Тут таксама 4 абітурыенты маюць суму балаў ад 391 да 400. 10 чалавек набралі ад 381 да 390 балаў і 20 чалавек — больш як 370 балаў.

На новых спецыяльнасцях інжынерна-эканамічнага факультэта «электронны маркетынг» і «эканоміка электроннага бізнесу» колькасць ахвотных ужо больш чым удвая перавышае колькасць бюджэтных месцаў. Тое ж тычыцца і яшчэ адной новай спецыяльнасці — «праграмаваныя мабільныя сістэмы». Затое не надта цікавяць моладзь факультэт радыётэхнікі і электронікі і факультэт тэлекамунікацый.

Прыёмныя камісіі будуць працаваць у суботу 27 ліпеня і ў нядзелю 4 жніўня. Апошні дзень прыёму дакументаў для навучання на платнай аснове — 4 жніўня.

А ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце сітуацыя пакуль і ўвогуле выглядае даволі сумна. Па стане на раніцу 23 ліпеня на спецыяльнасць «матэматыка і інфарматыка» было пададзена 27 заяў, а ўсяго тут гатовы прыняць на «бюджэт» 115 чалавек. На «фізіку і інфарматыку» падалі 9 заяў пры плане набору 75 чалавек. Пакуль што па колькасці пададзеных заяў лідзіруе «дашкольная адукацыя» (107 ахвотных на 170 месцаў). І «лагапедыя» — 77 заяў на 60 месцаў. Акрамя «лагапедыі», конкурсная сітуацыя складваецца таксама на спецыяльнасцях «сурдапедагогіка» (30 прэтэндэнтаў на 10 месцаў), «псіхалогія, сацыяльная псіхалогія» (30 прэтэндэнтаў на 15 месцаў) і «псіхалогія, педагагічная псіхалогія» (21 прэтэндэнт на 10 месцаў). Што тычыцца сумы балаў, з якой абітурыенты «штурмуюць» педагагічны ўніверсітэт, то больш як 300 балаў маюць з будучых педагогаў літаральна адзінкі. Затое хапае сярод абітурыентаў БДПУ маладых людзей, якія набралі ў суме за тры сертыфікаты і сярэдні бал атэстата крыху больш як 100 балаў. Можна меркаваць, што яны не без праблем пераадолелі ўстаноўлены на ЦТ мінімальны парог...

Сёлета назіраецца пэўная палярызацыя паміж тымі, хто атрымаў высокія вынікі, і тымі, хто не пераадолеў вызначаны парог. І адна, і другая група досыць вялікія.

Тым часам некаторыя ВНУ ўжо агучылі новыя «цэннікі» на адукацыю. Нагадаем, што на ўзроўні ўрада было прынята рашэнне аб павышэнні з 1 верасня кошту навучання ў вышэйшых навучальных установах (і дзяржаўных, і прыватных) у межах 20%.

У Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце для першакурснікаў лячэбнага, педыятрычнага і фармацэўтычнага факультэтаў кошт навучання складзе 16 млн 400 тысяч рублёў, на стаматалагічным — 19 млн 150 тысяч і на медыка-прафілактычным — 15 мільёнаў рублеў.

У БНТУ «цэннікі» на дзённай форме навучання будуць вагацца ў залежнасці ад факультэта ад 13 млн 335 тысяч да 14 млн 720 тысяч рублёў.

У Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце кошт навучання для першакурснікаў складзе 15 млн 244 тысячы рублеў, у БДУІР — ад 14 млн 605 тысяч да 16 млн 905 тысяч, а ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце — ад 11 млн 371 тысячы да 12 млн 10 тысяч рублёў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЗАЎВАГА: *інфармацыя аб ходзе прыёму заяў прыведзена ў артыкуле па стане на 9 гадзін раніцы 23 ліпеня.*

Директор школы, гимназии, лицея
Общество с ограниченной ответственностью «Медиа компас». УНП 191564154, свидетельство Министерства информации РБ о гос. регистрации СМИ. № 1497 от 13.12.2011 г.
Руководитель учреждения дошкольного образования
Общество с ограниченной ответственностью «Медиа компас». УНП 191564154, свидетельство Министерства информации РБ о гос. регистрации СМИ. № 1498 от 13.12.2011 г., перерегистрировано 25.05.2012 г.

Айцец Фёдар ПОЎНЫ:

«...І такім прыярытэтам сталі апошнія 25 гадоў адраджэння нашай царквы і веры»

Напярэдадні святочных падзей у гонар 1025-годдзя Хрышчэння Русі настаяцель прыходу Усіхсвяцкай царквы, протаіерэй Фёдар Поўны, разважае пра тое, што азначае для нашага грамадства гэтая падзея, якое значэнне яна мае для ўсіх краін гістарычнай Русі, найперш для Расіі, Беларусі і Украіны.

Фота БЕЛТА.

— Святочныя падзеі, звязаныя з 1025-годдзем Хрышчэння Русі, павінны дапамагчы ўсім нам адчуць духоўную еднасць і подых гісторыі, — кажа айцец Фёдар. — Гэта паспрыяе набыццю свайго свабоднага, самабытнага шляху ў будучыню. Зараз мне гэта здаецца надзвычай важным. Усе мы павінны разумець, што менавіта хрышчэнне Русі хаваецца ў падмурку фарміравання нашай цывілізацыі. Вернасць гэтым духоўным асновам ёсць залог таго, што мы застанемся самімі сабой, а значыць, будзем па-сапраўднаму шчаслівымі. Бо не могуць быць шчаслівымі народы, якія здрадзілі сабе, якія не сталі духоўна свабоднымі.

Калі азірнуцца на ўвесь перыяд пасля хрышчэння, то можна шмат што сказаць пра кожны з этапаў гістарычнага шляху. Аднак, мне думаецца, правільным быў пасыл Патрыярха Кірыла аб неабходнасці выбару пэўнага прыярытэту. І такім прыярытэтам сталі апошнія 25 гадоў адраджэння нашай царквы і веры. Гэта была чвэрць стагоддзя радыкальных змен у нашай дзяржаве — набыцця і асэнсавання сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці, што цесна звязана з царкоўным жыццём.

Святкаванне павінна зафіксаваць гады царкоўнага адраджэння ў гістарычнай памяці людзей. З пункту гледжання адраджэння царкоўнага жыцця гэтыя 25 гадоў, як адзначае Патрыярх Кірыл, — феномен, якому няма роўных у сусветнай гісторыі. Нідзе за такі кароткі прамежак часу не было пабудавана столькі храмаў, створана столькі хрысціянскіх абшчын, ніколі не назіралася такога магутнага прарыву ў рэлігійным жыцці, як гэта адбылося на прасторы гістарычнай Русі. Дастаткова прыгадаць, што ў Мінску было некалі два дзейныя храмы. І вось сёння мы бачым у вялікай колькасці ўзведзеных храмаў людзей маладога і сярэдняга ўзросту. Храмы запоўнены, і гэта залог духоўнага здароўя, залог нашай будучыні. І вельмі важна даць зразумець усім людзям, чаму гэта стала магчымым.

Якая ж сіла дапамагала нашым народам зрабіць такія пераўтварэнні? Якая сіла падштурхнула асабіста мяне кінуць уладкаванае жыццё ў Германіі ў складаныя 90-я гады развалу і заняпаду, вярнуцца сюды, заняцца тым, што дало такія плады? Калі цяпер мы кажам пра развіццё любой галіны нашага жыцця — эканомікі, палітыкі, культуры, навукі, адукацыі, спорту, то да кожнай з іх у нас ёсць пытанні. Аднак няма ніякіх пытанняў, якія датычыліся б адраджэння рэлігійнага жыцця. Гэта і ёсць феномен, да якога мы ўсе маем дачыненне. Нам, у нашай краіне, не сорамна цяпер бачыць кіраўнікоў цэрквяў іншых дзяржаў, паказваць тое, што мы паспелі зрабіць. У нас ужываюцца традыцыі і сучаснасць. І мы павінны памятаць, што наогул усё вельмі цесна ўзаемазвязана. Не можа быць эканомікі дзеля эканомікі або духоўнасці дзеля духоўнасці. Усё павінна быць у гармоніі, як гэта павінна быць у самім чалавеку.

Лакаматывам нашага далейшага развіцця павінна стаць развіццё духоўнага, рэлігійнага жыцця людзей. Размова ідзе пра вынік таго ўзаемадзеяння, якое царква ажыццяўляе з грамадствам. Пра рэальнае ўцаркоўленне соцень тысяч людзей, змяненні іх псіхалогіі, асабістых арыенціраў. Заўважце, усё гэта адбываецца ў той час, калі мы гаворым пра сусветны эканамічны і фінансавы крызіс. Разважлівыя аналітыкі сцвярджаюць, што прычына такога становішча — у крызісе асобы чалавека. І вы разумееце, што азначае рэлігійнае адраджэнне на фоне гэтага крызісу...

Падзеі, звязаныя са святкаваннем, могуць быць той сферай, дзе нашы народы здольныя многае дапамагчы зразумець сучаснаму чалавецтву. Мы павінны зафіксаваць зробленае, зрабіць зразумелым для свету гэты наш шлях.

Патрыярх Кірыл заўважае, што пасланне, якое павінна несці ў сабе падзея 1025-годдзя Хрышчэння Русі, павінна быць зроблена на зразумелай мове, даступнай сучасным людзям, асабліва моладзі. Таму тыя святкаванні, якія адбудуцца ў нашай сталіцы, — простыя, у даступнай форме.

Дарэчы, яшчэ ніколі на нашай зямлі не збіраліся кіраўнікі ўсіх памесных цэркваў. А 10-й гадзіне 29 ліпеня на Замчышчы адбудзецца літургія з удзелам запрошаных кіраўнікоў цэркваў і іх прадстаўнікоў. А 19-й гадзіне ўрачыстасці працягнуцца ля Храма-помніка ў гонар Усіх Святых і ў памяць бязвінна забітых у нашай Айчыне, што на скрыжаванні вуліц Каліноўскага і Усіхсвяцкай. Запланавана канцэртная праграма, а таксама ўпершыню можна будзе пакланіцца Андрэеўскаму крыжу, які размесціцца на ўваходзе ў крыпту да 2 жніўня.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Змагаемся з ракам

КОЛЬКІ ГАРОДНІНЫ, САДАВІНЫ, ЗЯЛЕНІВА ВЫ З'ЕЛІ СЁННЯ?

Здаровае харчаванне, рэгулярныя заняткі спортам і, адпаведна, кантроль вагі дазваляюць знізіць рызыку захворвання на рак на 15-30 працэнтаў. Гэта ўстанавілі іспанскія анколагі падчас даследавання ўзаемасувязі паміж узнікненнем ракавых захворванняў і харчаваннем, якое з'яўляецца асноўнай прычынай раку кішэчніка і прастаты.

Іспанскае выданне El Mundo таксама ўдакладняе, што адным з прадуктаў, якія адыгрываюць важную ролю ў папярэджванні раку кішэчніка і прастаты, з'яўляюцца памідоры. Яны змяшчаюць лікапен, які надае памідорам чырвоны колер і не толькі можа абараніць мужчын ад раку прастаты, але і папярэджвае развіццё ракавых захворванняў у жанчын. Наогул ужо вядома, што ўжыванне ў ежу вялікай колькасці гародніны, садавіны і зяленіва, а таксама іншых прадуктаў, якія змяшчаюць клятчатку, значна змяншае небяспеку захворвання на рак. Наогул разнастайная дыета, багатая на раслінныя элементы і прадукты, карысная для здароўя. Даследаванні, якія праводзіліся ў краінах Азіі, дзе аснову рацыёну складаюць соевыя прадукты, указваюць на прафілактыку раку з іх дапамогай. Праўда, гэтыя звесткі пакуль не пацверджаны ў дачыненні да краін Захаду.

Эксперты сцвярджаюць, што яшчэ недастаткова вывучана пытанне аб тым, якія прадукты зніжаюць рызыку развіцця раку малочнай залозы, які ў апошнія гады стаў найбольш распаўсюджаным анкалагічным захворваннем сярод жанчын. Хоць добра вядома пра пэўную сувязь развіцця раку малочнай залозы з ужываннем алкагольных напояў. Штодзённае ўжыванне 10 г алкаголю ўрэшце павялічваюць рызыку развіцця раку ў жанчын на 10 працэнтаў.

Яшчэ адным фактарам рызыкі з'яўляецца атлусценне, у прыватнасці, прыбаўка ў вазе падчас менапаўзы ў жанчын. Кожныя 5 кг лішняй вагі, набраныя падчас менапаўзы, павялічваюць рызыку развіцця раку таксама недзе на 10 працэнтаў. Менавіта таму рэкамендуецца рэгулярная фізічная актыўнасць.

Ёсць і іншыя фактары, якія павышаюць або змяншаюць небяспеку захворвання на рак, але пакуль не пацверджаны даследаваннямі. Мяркуецца, што міжземнаморская дыета і аліўкавы алей зніжаюць рызыку развіцця раку. Само па сабе мяса не называецца канцэрагенам, аднак яго ўжыванне ў празмернай колькасці павышае рызыку раку кішэчніка.

Ганна КУЛАКЕВІЧ.

Новы супрацьпухлінны прэпарат праходзіць выпрабаванні

У Мінску ў бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі (БХМД) праводзяцца клінічныя выпрабаванні гідрагелю «Тэмадэкс», які разыходзіцца ў арганізме. Субстанцыю для яго робяць на НВ РУП «Унітэхпрам БДУ», а лекавую форму — на прадпрыемстве «Белмедпрэпараты». Пра гэта карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» паведаміў дырэктар вучэбна-навукова-вытворчага прадпрыемства «Унітэхпрам БДУ» Павел Бычкоўскі.

Таксама клінічныя выпрабаванні новага прэпарата праходзяць у РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі ім. М.М. Аляксандрава.

Атрыманы першыя вынікі, якія сведчаць пра станоўчы эфект.

— Прымяненне прэпарата ў камбінаванай хіміяпрамянёвай тэрапіі гліём галаўнога мозга (III-IV стадыі) павялічвае працягласць бязрэцыдыўнага перыяду і працягласць жыцця хворых, — распавялі ўрачы.

Вытворчасцю супрацьпухлінных лекавых прэпаратаў на прадпрыемстве «Унітэхпрам БДУ» займаюцца не першы год. Тут, напрыклад, выпускаюць прэпарат «Цысплацел» (распрацаваны ў НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ), прызначаны для лакальнай хіміятэрапіі злаякасных пухлін галаўнога мозга, шыі, поласці рота, языка, носа і прыдаткавых пазух.

— Гэта другі ў свеце прэпарат па сваім тэрапеўтычным дзеянні, ён запатэнтаваны на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, — растлумачыў П. Бычкоўскі. — Разам з тым кошт адной упакоўкі амерыканскага аналага 18 тыс. долараў, а нашага — 320 долараў.

Прымяненне «Цысплацела» дапамагло паправіцца палове пацыентаў, якім выдалілі пухліны розных лакалізацый на галаве і шыі, у астатніх частата рэцыдываў знізілася на 25-40%. Да ведама, падчас лячэння лекавы сродак у форме невялікай шчыльнай тканевай сурвэткі, якая ў далейшым разыходзіцца ў арганізме, змяшчаюць у месца пасля выдалення пухліны. Прэпарат знішчае рэшткавыя блукаючыя ракавыя клеткі з гарантыяй таго, што на месцы выдаленай пухліны не пойдуць метастазы.

У перспектыве на НВ РУП «Унітэхпрам БДУ» плануюць асвоіць выпуск супрацьпухліннага прэпарата для лячэння раку страўніка.

«Мінск—Навіны»

НОГІ ЎГОРУ, або Змагаемся з ацёкамі

